Радио "Беларусь" / Radio Belarus

**Запрашаем вас прыняць удзел у новай акцыі**

Шаноўныя сябры! У кожнага ёсць родны куток, да якога, па словах нашага славутага земляка Францыска Скарыны, мы ўсе “вялікую ласку маем”. Гэта месца, дзе мы нарадзіліся і выраслі, дзе жывуць нашы блізкія і родныя. Так сталася, што многіх жыццёвая дарога вывела ў вялікі свет, далёка за межы родных мясцін. Прышліце вестачку малой радзіме, родным і блізкім, землякам!

Гэта можа быць здымак на фоне вашых сённяшніх гарадоў і краін ці асабістыя здымкі з архіва, сэлфі з вашымі дзецьмі і ўнукамі, бацькамі і дзядамі.

Для некаторых Беларусь – гэта радзіма вашых продкаў, дзе засталіся карані вашых родаў. Яна таксама чакае вашага прывітання! Да здымкаў вы можаце далучыць вашы лісты-прывітанні ці ўспаміны.

Лепшыя матэрыялы будуць адзначаны прызамі! Свае лісты дасылайце, калі ласка, на адрас **hellobelarus@gmail.com**